Спорт-тайм

# БЕЛАРУСЫ КАНКУРЭНЦЫІ НЕ БАЯЦЦА

## У традыцыйным аглядзе «Звязды» — добрыя спартыўныя навіны

**ГЕРАІНЯ ТЫДНЯ.** У сталіцы Катара горадзе Доха праходзіць чэмпіянат свету па водных відах, на якім, нягледзячы на нейтральны статус, беларускія спартсмены праяўляюць сябе досыць ярка. Сінхраністка Васіліна Хандошка заваявала бронзавы медаль у адвольнай праграме ў дысцыпліне «сола». Да гэтага яна заняла чацвёртае месца па выніках тэхнічнай праграмы.

Таксама на дыстанцыі 100 метраў брасам беларуска Аліна Змушко выйшла ў паўфінал спаборніцтваў. Сярод 54 дзяўчат яна паказала чацвёрты час — 1:06,77 сек, які на дзве секунды перавысіў алімпійскі нарматыў. Такім чынам, Аліна Змушко атрымала ліцэнзію на Алімпійскія гульні ў Парыж.

**ПЕРАМОГА ТЫДНЯ.** Беларуская тэнісістка Алена Фалей стала пераможцай турніру ITF у французскім Грэноблі з прызавым фондам $60 тыс. У фінале беларуска адолела ў трохсэтавым паядынку французжанку Манон Леанард — 6:1, 4:6, 6:4. Пасля гэтага поспеху 19-гадовая Алена Фалей узнялася адразу на 48 пазіцый у сусветным рэйтынгу і цяпер знаходзіцца на 201-м месцы.

**АБ'ЯВА ТЫДНЯ.** Беларусь і Узбекістан будуць дапамагаць адно аднаму ў падрыхтоўцы спартсменаў. Аб гэтым расказалі ў Міністэрстве спорту і турызму. Па выніках перагавораў прэзідэнтаў Беларусі і Узбекістана ў Ташкенце бакі падпісалі некалькі дакументаў у спартыўнай і турыстычнай галінах. Так, заключана праграма супрацоўніцтва паміж Міністэрствамі спорту і план мерапрыемстваў па развіцці супрацоўніцтва ў сферы турызму на 2024—2025 гады. «У першую чаргу мы робім акцэнт на развіцці зімовых відаў спорту. У нас вельмі добра развіты біятлон, хакей, фрыстайл (мы традыцыйна адна з наймацнейшых зборных на еўрапейскім кантыненце). Таму ва ўзбекскага боку была просьба аказаць садзейнічанне ў падрыхтоўцы спартсменаў менавіта ў гэтых відах спорту. У сваю чаргу мы зацікаўлены ў садзейнічанні па відах спорту, якія традыцыйна развіты ва Узбекістане: гэта бокс, таэквандо, адзінаборствы. Такая сумесная інтэграцыя, я думаю, прывядзе да яшчэ больш высокага выніку пры выступленнях на міжнароднай арэне», — сказаў міністр спорту і турызму Сяргей Кавальчук.

**ТУРНІР ТЫДНЯ.** На пляцоўцы сталічнай «Чыжоўка-Арэны» завяршыўся міжнародны турнір па хакеі «Кубак Будучыні» з удзелам найлепшых маладых гульцоў з Беларусі, Расіі і Казахстана. У мінулым годзе пераможцамі турніру сталі беларускія хакеісты. Сёлета яны абаранілі тытул. У вырашальным матчы беларусы сустрэліся з расійскай зборнай U-18. З вынікам 6:5 перамагла беларуская маладзёжка. Трэцяе месца на турніры-2024 заняла каманда Расіі-U17, якая абыграла маладзёжную зборную Казахстана з лікам 7:4.




**ЛІЧБА ТЫДНЯ.** Пяць медалёў заваявалі беларусы на адкрытым чэмпіянаце Афрыкі па дзюдо, які завяршыўся ў Тунісе. На спаборніцтвах выступілі амаль 200 атлетаў з 35 краін, якія разыгралі 14 камплектаў узнагарод (па 7 у мужчын і жанчын). Уладальніцай «золата» ў вагавой катэгорыі да 63 кг стала Яна Макрэцкая. У мужчынскай частцы турніру да фіналаў у сваіх катэгорыях дайшлі трое беларусаў, але кожны з іх у выніку здавальняўся срэбранай узнагародай. Конрад Шока стаў прызёрам у катэгорыі 66 кг, Руслан Галавачоў — у катэгорыі да 73 кг, Ягор Кухарэнка заваяваў серабро ў катэгорыі звыш 100 кг. Адзіны бронзавы медаль беларускай камандзе прынёс Аляксандр Сідорык (да 90 кг).

**ГУЛЬНЯ ТЫДНЯ.** У Мінску прайшоў Кубак дружбы па баскетболе сярод жаночых каманд. У першым матчы перамогу святкавалі спартсменкі нацыянальнай зборнай Беларусі — 73:70. Але ўжо ў другой гульні мацнейшымі аказаліся расійскія баскетбалісткі — матч скончыўся з вынікам 83:60.

**НАДЗЕЯ ТЫДНЯ.** Беларускія каратысты выступілі на першынстве Еўропы па каратэ сярод кадэтаў (да 16 гадоў), юніёраў (да 18 гадоў) і моладзі (да 21 года). Нашу каманду прадстаўлялі 17 хлопцаў і 13 дзяўчат, дабрацца да медалёў удалося толькі двум атлетам: бронзавымі прызёрамі форуму сталі Яна Коннава (U18, да 59 кг) і Мікіта Сахвон (U21, да 84 кг).

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота БелТА.**

# СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.34 | 18.13 | 9.39 |
| Віцебск — | 8.28 | 18.00 | 9.32 |
| Магілёў — | 8.25 | 18.04 | 9.39 |
| Гомель — | 8.17 | 18.04 | 9.47 |
| Гродна — | 8.49 | 18.29 | 9.40 |
| Брэст — | 8.45 | 18.34 | 9.49 |

### Месяц

*Маладзік 10 лютага. Месяц у сузор'і Авена.*

### Імяніны

***Пр.*** *Віктара, Івана, Кіра, Клаўдзія, Мікіты, Нікіфара.*
***К.*** *Арлеты, Катарыны, Рыгора, Юльяна.*



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

# ЗАЎТРА




## 13 ЛЮТАГА Даты Падзеі Людзі

**У краіне**

**1387** год — кароль польскі і вялікі князь літоўскі Ягайла выдаў граматы аб надзяленні прывілеямі феадалаў ВКЛ, якія прынялі каталіцтва.

**1894** год — нарадзіўся Мартын Мартынавіч Карклін, беларускі дзяржаўны дзеяч. У 1925—1930 гадах — намеснік старшыні СНК БССР, старшыня Дзяржаўнай планавай камісіі і Эканамічнага савета пры СНК БССР. З 1930 года працаваў намеснікам старшыні праўлення Дзяржбанка СССР.



**1919** год — савецка-польская вайна: атрад польскіх салдат пад камандаваннем капітана Мяніцкага атакаваў савецкія падраздзяленні ў раёне Бярозы-Картузскай. Бой за Бярозу-Картузскую лічыцца першым баявым сутыкненнем савецка-польскай вайны.

**1927** год — нарадзіўся Аляксандр Аляксандравіч Запарожац, беларускі вучоны ў галіне паталагічнай фізіялогіі, доктар медыцынскіх навук, прафесар. Аўтар навуковых работ па даследаванні інфекцыйнага працэсу і прафілактыцы ўскладненняў пасля аперацый на органах страўнікава-кішачнага тракта. Даў новыя ўяўленні аб механізмах узнікнення перытаніту і знітавальнага працэсу пасля аперацый на страўніку. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі.

**У свеце**

**1769** год — нарадзіўся Іван Андрэевіч Крылоў, рускі пісьменнік, байкапісец, журналіст, акадэмік Пецярбургскай АН. Пісаў трагедыі і камедыі, оперныя лібрэта. Байкі І. А. Крылова перакладзеныя больш чым на 50 моў свету, у тым ліку і на беларускую.

**1929** год — англійскі мікрабіёлаг Аляксандэр Флемінг зрабіў у Медыцынскім клубе першае паведамленне аб адкрыцці ім пеніцыліну.

**1934** год — у Чукоцкім моры быў раздушаны льдамі і затануў савецкі параход «Чалюскін». 104 чалавекі, уключаючы жанчын і дзяцей, на чале з начальнікам экспедыцыі О. Ю. Шмітам пакінулі карабель і апынуліся на безжыццёвых арктычных ільдах пры тэмпературы каля -40 градусаў. Сталін катэгарычна адмовіўся ад любога замежнага садзейнічання ў выратаванні членаў экспедыцыі. Выратаванне людзей ажыццяўлялася выключна сіламі грамадзян СССР. У чаканні ратавальнікаў ім прыйшлося прасядзець на крызе ад трох тыдняў да двух месяцаў. 5 сакавіка да базы чалюскінцаў прабіўся лётчык Анатоль Ляпідзеўскі на самалёце АНТ-4. Ён змог забраць дзесяць жанчын і дваіх дзяцей. Наступны рэйс адбыўся толькі 7 красавіка. За тыдзень вывезлі астатніх «палонных». 13 красавіка аперацыя была завершана.

**Так гаварыў...**

**АЛЯКСАНДР ГЕРЦЭН:**

*«Няма злейшай пакуты як нічога не рабіць».*

## УСМІХНЕМСЯ

**— Чым збіраешся заняцца ў выхадныя?**
**— Я даўно не быў на канапе, шмат спраў там сабралася.**

Што значыць «У мяне няма часу выслухоўваць тваё ныццё»? Плануй свой дзень. Уставай на гадзіну раней!

**Некалі мне, магчыма, не шанцавала з мужчынамі... Мінуў час. Я паразумнела... Цяпер мужчынам не шанцуе са мной!**

Ніколі не кажы: «Я памыліўся». Кажы: «Гэта ж трэба, як цікава атрымалася!»

**Нахабства — гэта калі муха мыецца, седзячы на мухабойцы.**

Мае «былыя» — гэта доказ, што я не вядуся ні на грошы, ні на знешнасць.



ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс);
аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.
прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27,
e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 10.985. Індэкс 63850. Зак. № 368.
Нумар падпісаны ў 19.30 12 лютага 2024 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12